Источник: **«Звязда» - 2012-02-24**

**Пётр НІКІЦЕНКА: «Беларусі лёсам наканавана стаць зборачным і канструктарскім цэхам свету»**

**Прысутнасць Беларусі ў Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) — відавочна, самая актуальная тэма для разваг вядучых эканамістаў краіны. Сёння на гэтую тэму карэспандэнт "Звязды" гутарыць з доктарам эканамічных навук, прафесарам, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятром Нікіценка.**



**— Пётр Георгіевіч, што вы думаеце з нагоды размоў, каментарыяў і публікацый аб тым, што АЭП — гэта вынаходніцтва Крамля з мэтай заманіць спачатку Беларусь і Казахстан, а затым і Украіну пад сваю былую імперскую ўладу?**

— Я ўпэўнены ў тым, што АЭП не пагражае стратай суверэнітэту ні нам, ні Казахстану, ні тым больш Расіі. Гэта ўсё чуткі, яны не вартыя ўвагі. А вось дапамагчы застацца нам як партнёрам пры сваіх эканамічных інтарэсах АЭП можа. Бо адна з відавочных рыс глабалізацыі эканомікі — узмацненне канкурэнцыі з боку вытворцаў азіяцкіх краін, якія сёння хутка і дынамічна развіваюцца. Прычым канкурэнцыі далёка не заўсёды добрасумленнай. Таму АЭП прадастаўляе дадатковыя магчымасці для сумеснага супрацьстаяння такой пагрозе.

***— Дзякуй, супакоілі. Тады адкажыце на такое пытанне: як і наколькі далучэнне да АЭП можа радыкальна змяніць экспартна-імпартную і вытворчую палітыку Беларусі?***

— АЭП — гэта новыя перспектывы для актывізацыі і пашырэння інавацыйнага супрацоўніцтва ў міжнародным маштабе. АЭП дазволіць аб'яднаць у рамках навукова-тэхнічных, інавацыйных і інвестыцыйных праектаў інтэлектуальныя рэсурсы і навукова-вытворчы патэнцыял трох дзяржаў. А рэалізацыя гэтых сумесных планаў дапаможа вырашыць і важныя сацыяльна-эканамічныя задачы, якія даўно наспелі ў Беларусі, Расіі і Казахстане. У прыватнасці, для нашых вытворцаў сёння надзвычай актуальнай з'яўляецца задача павышэння спажывецкіх якасцяў прадукцыі, каб яна адпавядала стандартам сусветнага ўзроўню і была канкурэнтаздольная па цане і якасці ў краіне і на замежных рынках. Без гэтага не будзе росту экспарту і імпартазамяшчэння, запаволяцца паступленні ў краіну валюты, што можа зноў абвастрыць сітуацыю на фінансавым рынку.

Беларусь раней называлі зборачнымі цэхам Савецкага Саюза. Цяпер перад ёй адкрываецца перспектыва ўвогуле стаць зборачным і канструктарскім цэхам свету. Я лічу, што гэта рэальна. Сёння дзякуючы АЭП мы маем усе шанцы ператварыцца ў краіну актыўнага выкарыстання інтэлектуальных, навукаёмістых і экалагічна бяспечных тэхналогій. Бо ёсць два асноўныя крытэрыі эканомікі. Першы — захаванне прыроды, яе рэсурсаў для будучых пакаленняў. Другі — сам чалавек, развіццё яго розуму, паляпшэнне жыцця, забеспячэнне здароўя і "працаздольнага" даўгалецця.

***— Давайце канкрэтызуем ваш адказ. У чым перавагі Адзінай эканамічнай прасторы для нас, скажам, з пункту погляду нармальнага прагматызму?***

— Мы сёння маем магчымасць, напрыклад, атрымаць шырокі доступ да выкапняў Казахстана і Расіі. І тым самым забяспечыць нашу прамысловасць у дастатковых аб'ёмах сыравінай. Я думаю, што цяпер нам не варта развіваць энергетыку шляхам распрацоўкі ўласных радовішчаў вугалю ці сланцаў. Бо выкарыстанне айчынных прыродных рэсурсаў у энергетычных мэтах пакуль не абяцае быць эфектыўнай справай. На гэты конт існуе шмат аўтарытэтных экспертных заключэнняў. Няма сэнсу іх пераказваць. Адзначу, што нам эканамічна больш выгадна выкарыстоўваць замежныя крыніцы энерганосьбітаў: купляць іх, набываць ліцэнзіі на канцэсію ў суседніх краінах. А самім развіваць выпуск высокатэхналагічнай і навукаёмістай прадукцыі, запатрабаванай у АЭП і на знешніх рынках.

***— Патлумачце, калі ласка, сваю думку.***

— Напрыклад, у Расіі, Казахстане ці нават ва Украіне мы бяром канцэсію на здабычу вугалю (ён там па якасных характарыстыках значна лепшы за беларускі), хутчэй за ўсё, адну ці некалькі шахтаў, кажу ўмоўна. Пад іх мадэрнізацыю прыцягваем айчынныя і замежныя інвестыцыі. Такім чынам мы ствараем сумесны інвестыцыйны кластар, які будзе працаваць на энергетыку Беларусі. Нагадаю, кластар — гэтае аб'яднанне пад адным "дахам" эканамічна вельмі цесна звязаных фірмаў сумежнага профілю, якія зацікаўлены ва ўзаемным садзейнічанні агульнаму развіццю і росту канкурэнтаздольнасці. Такі падыход забяспечвае канкурэнтныя перавагі ўдзельнікам кластару ў параўнанні з іншымі прадпрыемствамі. У гэтым плане АЭП адкрывае перад намі новыя далягляды па выкарыстанні замежных інавацый для якаснай перапрацоўкі рэсурсаў Расіі і Казахстана. Вось у некалькіх словах сэнс сучаснай прамысловай палітыкі Беларусі ў вельмі адчувальнай для нас галіне энергетыкі.

Як вядома, "вузкае" месца нашай краіны — слабы рэсурсны патэнцыял. Мала ў нас, на жаль, каштоўных прыродных выкапняў, у прыватнасці, вуглевадародаў. А тыя, што ёсць, не даюць дастаткова сыравіны айчыннай індустрыі. Таму знявечваць нашу цудоўную і прыгожую зямлю кар'ерамі — не выгадна па многіх прычынах. Лепш развіваць экалагічны турызм, пракладваць "зялёныя" маршруты, чым ствараць велізарныя горы з пустой пароды вакол шахтаў.

***— Што яшчэ карыснага, акрамя карысных выкапняў, можа даць АЭП усім яе ўдзельнікам?***

— Дзякуючы членству ў АЭП тэрыторыя Беларусі становіцца больш прывабнай для замежных інвестараў: у іх з'явілася, кажучы ваеннай мовай, магчымасць набыць плацдарм для далейшага наступлення на рынкі Казахстана і Расіі. Гэта павышае нашы шанцы для прыцягнення інвестыцый у высокатэхналагічныя прадпрыемствы. З пачатку года расце інтарэс дзелавых людзей замежжа да нашай краіны, умоў эканамічнага супрацоўніцтва з намі ў рамках АЭП. Вось свежы прыклад. Навукоўцы-эканамісты ўніверсітэта імя Каперніка з польскага горада Торунь папрасілі мяне падрыхтаваць шэраг матэрыялаў для манаграфічнага выдання "Беларусь у сусветнай супольнасці". З палякамі ў нас шмат агульнага: мы ж некалі жылі ў адной дзяржаве. І сёння Польшча займае 6 месца (ці 2,8%) у аб'ёме нашага тавараабароту з 202 краінамі свету. Дык чаму не весці ўзаемавыгадны бізнэс? Але польскія ўлады не гатовы да гэтага.

Увогуле прыкладаў росту інтарэсу да нашай краіны шмат. У прыватнасці, мы, супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, зараз рэалізоўваем сумесны праект з украінскімі калегамі па развіцці інавацыйнага супрацоўніцтва Беларусі і Украіны. Наша задача — у недалёкай перспектыве давесці знешнегандлёвы тавараабарот да 10-15 мільярдаў долараў ЗША. Упэўнены, эканамічная інтэграцыя з Украінай, дзе магутныя навука і прамысловасць, абяцае

быць вельмі плённай. Як, між іншым, і развіццё знешнеэканамічных стасункаў з краінамі Балтыі. Іх марскія парты гатовыя весці справы на выгадных для нас умовах. Праз краіны Балтыі нам лягчэй выходзіць на рынкі Еўрапейскага саюза. Беларусі абавязкова трэба захоўваць і ўмацоўваць сваю прысутнасць у краінах, з якімі ў нас традыцыйна склаліся даўнія сяброўскія адносіны.

Членства ў АЭП таксама дазволіць актыўней ствараць сумесныя прадпрыемствы ў Беларусі, адкрываць зборачныя вытворчасці за мяжой. Я лічу, што нам трэба больш актыўна асвойваць афрыканскі кантынент. У Беларусі шмат прадпрыемстваў, якія здольныя забяспечыць там пераход нацыянальных эканомік на новыя энергаёмістыя тэхналагічныя платформы і вытворчасць новых відаў прадукцыі. Галоўнае, што ў афрыканцаў захаваліся добрыя адносіны да Беларусі і Расіі. Многія цяперашнія кіраўнікі і лідары краін Афрыкі некалі вучыліся ў нашых ВНУ.

***— Безумоўна, метал, вуглевадароды, нанатэхналогіі — вельмі важныя рэчы для поспеху. А ці заўсёды мы бяром у разлік чалавечы фактар пры складанні нашых велічных планаў на глыбокую перспектыву? Ці заўсёды ўлічваем бюракратычныя бар'еры на шляху дзелавой ініцыятывы? Пра яе разняволенне слоў шмат, а істотных зрухаў няма. Чаму?***

— Я ўжо гэтую думку выказваў, дазволю сабе яшчэ раз паўтарыць яе. Наспела неабходнасць кардынальных змен у светапоглядзе і філасофіі паводзін нашых начальнікаў рознага ўзроўню, чыноўнікаў, кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў і акцыянерных таварыстваў — адным словам, гаспадарнікаў. Праблема, на мой погляд, у тым, што мы проста баімся быць першымі ва ўкараненні тых або іншых інавацый, перад прыняццем адказнага рашэння любім перастрахавацца, лішні раз параіцца з начальствам па вертыкалі. Гэта не лепшая рыса нацыянальнага характару. Такая беларуская спецыфіка сур'ёзна стрымлівае дзелавую ініцыятыву знізу, не спрыяе ўкараненне інавацый ужо на псіхалагічным узроўні.

А дадайце да гэтага традыцыйна моцную ў Беларусі ролю дзяржавы. Без благаславення і падтрымкі з самага верху ў нас ніхто не тое што не асмеліцца на ўкараненне новага — хутчэй за ўсё, ніхто нават не рызыкне загаварыць, каб агучыць нейкія новыя паняцці. Так ужо склалася: для руху наперад нам неабходна па ўсёй вертыкалі ўлады санкцыя, каманда.

*Гутарыў*
*Леанід Лахманенка*